кацыі», «Гістарыёграф», «Вяртанне імёнаў» і інш. На старонках газеты выступаюць дзярж. дзеячы, кіраўнікі абл. і раённых структур, работнікі культуры і дзеячы мастацтва, гісторыкі, выкладчыкі ВНУ, творчая моладзь і інш. Прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» 1998. *С.С.Трафілаў.*

**КУЛЬТУ́РА МАЎЛЕ́ННЯ**, адпаведнасць індывідуальнага маўлення нормам дадзенай мовы; сістэма камунікатыўных якасцей маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць, багацце і разнастайнасць, дарэчнасць, чыстата і лаканічнасць). Пад К.м. разумеюць працэс гаварэння (маўленчую дзейнасць) і яго вынік (маўленчыя творы, якія фіксуюцца памяццю ці пісьмом). Маўленчая дзейнасць ажыццяўляецца ў адпаведнасці з пэўнымі правіламі, уласцівасцямі пэўнай мовы на пэўным этапе яе гіст. развіцця. Сукупнасць гэтых правіл (*норм моўных*) утварае сістэму мовы. К.м. грунтуецца на моўных нормах (арфаэпічных, акцэнталагічных, марфалагічных, сінтаксічных, фразеалагічных, лексічных, стыліст., пунктуацыйных, арфаграфічных), увасобленых у моўным матэрыяле, а моўная сістэма ствараецца, развіваецца і ўдасканальваецца толькі ў маўленчай дзейнасці. У адрозненне ад мовы маўленне рухомае, мэтанакіраванае, сітуатыўна і індывід. абумоўленае, канкрэтнае і матэрыяльнае, актуальнае і дынамічнае, лінейнае, адвольнае, варыятыўнае і інш. Паколькі мова выкарыстоўваецца і як сродак зносін і ў інш. сферах дзейнасці (напр., пазнавальнай, г.зн. мысленні, і інш.), вылучаюць уласна маўленне, або «знешняе» (камунікатыўна-накіраванае), і ўнутранае (накіравана на яго суб'ект, самога сябе для пастаноўкі і рашэння пэўных пазнавальных задач). «Знешняе» маўленне падзяляецца на маналагічнае (гл. *Маналог*) і дыялагічнае (гл. *Дыялог*). Застаючыся камунікатыўным, «знешняе маўленне» можа адначасова выконваць розныя дадатковыя функцыі (паэт., этычную, магічную, намінатыўную і інш.), у якіх яно набывае спецыфічныя заканамернасці ўнутранай арганізацыі, што дазваляе гаварыць пра паэт. маўленне, магічнае і інш. Працэс маўлення характарызуецца пэўным тэмпам, працягласцю, тэмбравымі асаблівасцямі, ступенню гучнасці, выразнасці і г.д. К.м можа быць ахарактарызавана таксама праз указанне на псіхалагічны стан таго, хто гаворыць, яго камунікатыўную задачу, адносіны да субяседніка, таму маўленне мае розныя вызначэнні: экспрэсіўнае, эмацыянальнае, шчырае, далікатнае, ліслівае і інш. Паводле сэнсавай структуры вылучаюць маўленне інтэлектуальнае, лагічнае, змястоўнае і г.д. У розных сац. сферах з'явы маўлення тыпізуюцца, утвараюць адносна самаст. сістэмы — функцыянальныя стылі. Праблемы К.м. даследуюць *мовазнаўства, літаратуразнаўства.*

*Літ.*: Леонтьев А.А. Язык, речь, речевая деятельность. М., 1969; Соссюр Ф. де. Труды по языкознанию. М., 1977; Лепешаў І.Я. Асновы культуры маўлення і стылістыкі. Мінск, 1989; Абабурка М.В. Культура беларускай мовы. Мінск, 1994; Тамашэвіч Т.І. Культура і тэхніка маўлення. Гродна, 2003.

*Т.У.Люковіч.*

**КУЛЬТУРАГЕНЕ́З**, працэс пастаяннага ўзнікнення новых культ. форм і іх інтэграцыі ў існуючыя культ. сістэмы; фарміраванне новых культ. сістэм і феноменаў. Асн. яго прычына — неабходнасць чалавецтва ў адаптацыі да зменлівых умоў існавання суб'ектаў культуры шляхам выпрацоўкі больш эфектыўных форм дзейнасці і сац. ўзаемадзеяння. Істотную ролю ў працэсе К. адыгрывае таксама індывід. творчы пошук у інтэлектуальнай, тэхн., маст. і інш. сферах. Структурна ў К. вылучаюцца такія асобныя працэсы, як генезіс культ. форм і норм, фарміраванне новых культ. сістэм чалавечых супольнасцей (сац., этнічных, паліт., канфесіянальных і інш.), а таксама міжэтнічных культ. супольнасцей і гіст. тыпаў культ. сістэм, якія адрозніваюцца спецыфікай сваіх экзістэнцыяльных арыентацый. Генезіс культ. форм магчыма структурыраваць на фазы ініцыіравання навацый, стварэння новых культ. форм, праверкі іх функцыянальнай і тэхнал. эфектыўнасці, укаранення ў сац. практыку. Праблемы генезісу чалавека як стваральніка культуры і прадукту культуры ў філагенетычным і антагенетычным планах даследуе гал. чынам *культурная антрапалогія.* *А.І.Смолік.*

**КУЛЬТУРАЛАГІ́ЧНАЯ АДУКА́ЦЫЯ**, кірунак вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «культуралогія», а таксама агульнаадукац. курс культуралогіі. Быў уключаны ў канцы 20 — пач. 21 ст. ў якасці абавязковага ў цыкл гуманітарных і сац.-эканам. дысцыплін вучэбных планаў усіх бел. ВНУ у адпаведнасці з Дзяржстандартам вышэйшай прафес. адукацыі. У БДУ, Бел. ун-це культуры і мастацтваў, Гродзенскім ун-це, Ін-це сучасных ведаў вядзецца падрыхтоўка кадраў па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры», створаны кафедры культуралогіі. У Рэсп. ін-це вышэйшай школы ажыццяўляецца перападрыхтоўка кадраў па спецыяльнасці «культуралогія» і павышэнне іх кваліфікацыі. У шэрагу ВНУ дзейнічаюць магістратура, аспірантура і дактарантура па фундаментальнай і прыкладной культуралогіі. У Бел. ун-це культуры і мастацтваў, Гродзенскім ун-це функцыянуюць саветы па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. За апошнія гады кафедрамі культуралогіі распрацаваны вучэбныя планы і праграмы па ўсіх культуралагічных дысцыплінах, выдадзены вучэбныя дапаможнікі пад рэдакцыяй І.В.Казаковай, Л.К.Кухто, І.Я.Левяша, І.В.Марозава, У.Ф.Мартынава, А.І.Смоліка, І.Я.Шыршова, В.Р.Языковіча. Стварэнне сістэмы айчыннай К.а. садзейнічае пашырэнню ведаў моладзі аб культуры, яе месцы і ролі ў бел. грамадстве. *Л.К.Кухто.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ